# Летапіс
# Вышамірскай сярэдняй школы
# Рэчыцкага раёна



Аўтар: Іванчыкава Крысціна Валер'еўна,

настаўнік гісторыі і грамадазнаўства

ДУА "Вышамірская сярэдняя школа

Рэчыцкага раёна" , Гомельская вобласць

аг. Вышамір, 2025

Гісторыя Вышамірскай сярэдняй школы Рэчыцкага раёна разглядаецца як ланцужок падзей, які практычна не мае канца. Гэта часцінка жыцця вышамірцаў і ўсіх тых, хто скончыў гэту школу, працаваў у тут у розныя перыяды яе існавання.

З успамінаў жыхара вёскі Вышамір Кротава Есіпа Пятровіча (1898 г.н.): "У 1908-1909 гадах настаўніка нанімалі з вёскі Пракісель. Працаваў ён з дзецьмі ў зімовы час. Адну зіму жыў у аднаго вучня, другую – у іншага. Карміліі настаўніка, давалі прытулак, плацілі яму бацькі вучняў" [1].

З 1920 па 1930 год у вёсцы Вышамір ужо існавала пачатковая школа. Дырэктарам і першым настаўнікам быў Мазураў Сяргей Кузьміч (1900 г.н.). Ён меў адукацыю трох курсаў школы другой ступені. Не меў жонкі і дзяцей. Будучы дырэктарам, ён увесь свой вольны час прысвячаў справам школы, якая на той момант размяшчалася ў звычайнай вясковай хаціне. Захаваўся спіс вучняў за 1921 год. Усяго 57 чалавек, потым – 49. Адзін раз упамінаецца прозвішча настаўніцы Сыравадскай (1885 г.н.), якая раней працавала ў вёсцы Грамыкі.

Як выглядала школа ўнутры, можна ўявіць, разглядаючы дакументы Вышамірскага сельскага Савета. Напрыклад, пратакол №1 ад 12.12.1924 года паведамляе, што для школы планавалася вырабіць 2 сталы, 2 табурэткі, 17 лавак, ложак, набыць два вядры, кубак, школьную шыльду, кніжную шафу. А пратаколам №7 ад 28.09.1925 года пастанавілі адкрыць "чырвоны куток" з невялікай бібліятэкай, зрабіць хату-чытальню. Усе жыхары з 14 да 55 гадоў павінны былі навучыцца чытаць. У дакументах 1928 года ўпамінаюцца некаторыя прозвішчы настаўнікаў: Чыстапьян, Байко, Сыравадская [2].

У 1930-х гадах у вёсцы Вышамір пачала працаваць поўная сямігадовая школа.



Будынак школы у 1930-я гады

Хадзілі ў школу з вёсак Вышамір, Ганчароўка, Сямёнаўка, Духанаўка, Дзятлаўка, Заскор'е, Лецяшын. Вучняў было больш за 50 чалавек. Дырэктарам школы з 1932 года стаў Куляшоў Георгій Лявонцьевіч. З'явіліся і першыя піянеры: Сініла Ганна Майсееўна (у будучым стала дырэктарам школы, у 1964-1977 гадах), Скаромны Васілій (будучы брыгадзір паляводчай брыгады №3 калгаса імя 22 з'езда КПСС), Сівіцкая Надзея Іванаўна (потым тэхнічка ў школе), Скаромны Мікіта Пятровіч (лётчык, які загінуў у час Вялікай Айчыннай вайны), Траццякоў Пётр Паўлавіч (будучы загадчык кафедры фізвыхавання Гомельскага дзяржаўнага ўніверсітэта), Скаромная Ганна Васільеўна (была расстраляна фашыстамі) і іншыя. Першым піянерважатым бюў Лявіцкі А.А., які потым працаваў у рэдакцыі газеты "Дняпровец".

У гады Вялікай Айчыннай вайны педагогі ў каторы раз даказалі свае патрыятызм, адказнасць, мужнасць. Многія настаўнікі школы з першых дзён вайны пайшлі дабравольцамі на фронт: Карлоўскі Іван Нікіфаравіч, Станоўскі Павел Севасцьянавіч, Кантурэўскі Іван Сідаравіч, Шэлег Іван Кірылавіч і іншыя. Былі сярод іх і партызаны: Склімянок Рыгор Антонавіч, Пятроў Андрэй Нікіфаравіч, Чыстап'ян Пётр Міхайлавіч і іншыя.



*Некаторыя настаўнікі, якія з першых дзён абаранялі Айчыну*

*(Чыстап'ян П.М., Карлоўскі І.Н., Шэлег І.К.)*

Ва ўсе часы ў Вышамірскай школе працавалі самаадданыя настаўнікі: Макарэвіч Зінаіда Андрэеўна, Кавалёва Васіліса Сямёнаўна, Бадзюк Валянціна Аляксандраўна, Склімянок Яўген Рыгоравіч, Чайка Вера Якаўлеўна, Прылуцкая Раіса Мікалаеўна, Курыловіч Надзея Цімафееўна, Грушанава Людміла Іванаўна і іншыя.



*Педагагічны калектыў у першыя пасляваенныя гады*



Педагагічны калектыў у 1950-1960-я гады




Педагагічны калектыў у 1970-1980-я гады

Можна дакладна сказаць, што педагагічны калектыў быў не толькі прафесійным, самаадданым, патрыятычным, але і творчым. Сёння ў школьным музеі захоўваецца сшытак вершаў адной з настаўніц – Макарэвіч Зінаіды Андрэеўны. Вось адзін з іх, прысвечаны настаўніцкай справе:

"Учительские годы, хорошие годы.

Я в памяти их берегу.

Школьные годы, рабочие годы –

Я их позабыть не могу.

Класс, ребятишки, парты и книжки

И черная доска в углу...

Встают предо мною те годы чредою,

Я в памяти их берегу...”



Макарэвіч З.А., адна з першых настаўніц

З 1939 года дырэктарам школы быў Кавалёў Нікіфар Іванавіч. У школе на той момант было 5 класных пакояў (2 з іх размяшчаліся па-за школай – у “кулацкіх” дамах Фядосавай і Аляксеевай). Падчас ваеннага ліхалецця вёска Вышамір была спалена, у тым ліку і школа. А пасля вызвалення ў 1943 годзе і да 1947 года школа размяшчалася ў хаце “кулака”, якую перацягнулі з вёскі Новы Барсук.

У канцы 1947 года ў вёсцы Вышамір пабудавалі новы будынак школы, які прастаяў да 1994 года.



Будынак школы ў 1940-я гады

Дырэктарам школы з 1947 года стаў Кукса Аляксей Фядотавіч (працаваў да 1960 года). Менавіта пасля вайны школа распачынае сваё самастойнае гаспадарчае жыццё.

На прышкольным участку вучні вырошчвалі розныя культуры: жыта, агуркі, памідоры, цыбулю, фасолю. Даглядалі садовыя дрэвы і кусты: яблыні, маліну, вішні, ігрушы і іншыя. Атрыманы даход ад продажу агародніны і садавіны выкарыстоўвалі на патрэбы школы [2].



Нарыхтоўка вучнямі сена для жывёл



Вучні школы падчас апрацоўкі школьнага поля




Першы пасляваенны выпускны клас Вышамірскай школы

З 1967 года ў вёсцы Вышамір адчынілася сярэдняя школа. Дырэктарам у гэты час працуе Лохман Ганна Майсееўна (да студзеня 1977 года). Школа ўжо мела 6 класных пакояў, фізкабінет, хімкабінет, майстэрню, бібліятэку, піянерскую. Дзеці займаліся ў дзве змены. Было па некалькі паралельных класаў.

Дзякуючы намаганням таленавітых настаўнікаў, са школы выпускаліся выбітныя вучні. Ужо ў 1968 годзе дзве вучаніцы скончылі 10 класаў з "залатымі" медалямі. Гэта Ляшчынская Тамара і Шкуратава Раіса [1].




Вучні пачатковых класаў, 1969 год

У 1960-1980-я гады ў нашай краіне асабліва актывізавалася краязнаўчая, пошукавая і даследчая праца. З'явілася шмат аматараў беларусазнаўства і краязнаўства, якія пачынаюць актыўна даследаваць гісторыю і культуру свайго краю. У гэты час праводзяцца паходы, экскурсіі, экспедыцыі, археалагічныя даследаванні. Актывізуецца ваенна-патрыятычная праца [3].

Не выключэннем стаў і наш рэгіён. Асаблівае месца ў жыцці школы і спісах яе перамог пачынае займаць гісторыка-краязнаўчы школьны музей (распачаў дзейнасць з 1972 года). Яго пачынальніцай стала настаўніца гісторыі Бадзюк Валянціна Аляксандраўна.



Бадзюк В.А. на ўроку гісторыі



Бадзюк В.А. падчас арганізацыі шматдзённага паходу

З яе ўспамінаў пра часы працы ў Вышамірскай школе мы даведаліся, што ў тыя часы разам з вучнямі шмат вандравалі (пешшу, на цягніках, аўтобусах). Самымі цікавымі сталі вандроўкі ў Свята-Троіцкую Аляксандраўска-Неўскую Лаўру, на Чарнігаўшчыну. Наведалі амаль усю еўрапейскую частку Савецкага Саюза. Шмат увагі надзялялі гістарычнай памяці. Валянціна Аляксандраўна ўспамінае, што ў вёску Вышамір прыязджала шмат родных загінуўшых салдат падчас Вялікай Айчыннай вайны. Так шмат, што нават з аўтастанцыі ладзілі дадатковыя аўтобусныя рэйсы. Усе ўспаміны запісваліся, матэрыялы і фотаздымкі збіраліся. Так, кропля за кропляй, закладваўся фундамент школьнага музея. [4].



*Адкрыццё музея ў школе*

Музейную справу ў Вышамірскай школе працягнула таленавітая піянерважатая Траццякова Тамара Мікалаеўна (з 1982 года яна стала настаўнікам гісторыі).



*Кротава Тамара Мікалаеўна на ўроку ў музеі*

Пад кіраўніцтвам Тамары Мікалаеўны вучні школы актыўна ўключаліся ў пошукавую, даследчую, краязнаўчую працу. Сумеснымі намаганнямі фонд музея пашыраўся, дапаўняўся і ўзбагачаў скарбонку перамог. Да 2008 года (час выхаду Тамары Мікалаеўны на пенсійны адпачынак) Вышамірскі школьны музей ужо быў моцным цэнтрам патрыятычнага выхавання моладзі, меў

выдатны спіс з перамог у разнастайных конкурсах. Дарэчы, сёння Вышамірскі школьны комплексны музей – гэта галоўная каштоўнасць установы адукацыі. Менавіта ў ім можна пазнаёміцца з важнымі вехамі гістарычнага развіцця Вышамірскай школы, аг. Вышамір і населеных пунктаў, якія знаходзяцца побач. І сам музей з'яўляецца справай, аб'ектам зацікаўленасці і годнасцю многіх пакаленняў дзяцей і настаўнікаў школы.



Школьны музей зараз

Паказчыкам плённай працы вучняў і настаўнікаў з'яўляюцца таксама шматлікія перамогі ў разнастайных выхаваўчых, пазнавальных і творчых мерапрыемствах. Напрыклад, у 1969 годзе рэдакцыя газеты "Піянер Беларусі", ЦК ЛКСМ Беларусі і Рэспубліканскі Савет піянерскіх арганізацый імя У.І. Леніна ўзнагароджвалі піянерскую дружыну Вышамірскай школы за перамогу ў конкурсе-аглядзе "Чырвоная гваздзіка".




Самая "сталая" грамата Вышамірскай школы,

якая дайшла да нашых дзён

З 1970 года вучні школы пад умелым кіраўніцтвам настаўніцы хіміі і біялогіі Кулагі Кацярыны Фёдараўны прымалі ўдзел ва Усесаюзнай выставе дасягненняў народнай гаспадаркі СССР. Актыўныя ўдзельнікі гэтай выставы, уладальнікі пасведчанняў Галоўнага камітэта Кулага Алег, Пяшкун Валянціна, Ткачова Зінаіда, Смірноў Уладзімір, Катлабай Дзмітрый, Склімянок Алена. Медалём за дасягнутыя поспехі ў развіцці народнай гаспадаркі СССР узнагароджана Кротава Вольга. У 1980 годзе каманда Вышамірскай школы заняла 1 месца ў раённым злёце каманд юных інспектараў дарогі. А ў 1983 годзе вучні школы разам з настаўнікамі прынялі актыўны ўдзел у "Выставе кветак-83". Кампазіцыі нашай школы былі адзначаны як глыбока ідэйныя, змястоўныя. Прысвечаны яны былі барацьбе за мір на нашай планеце: "Бессмяротны подзвіг савецкага народа", "Вітаем юнацтва Кубы" і інш. 1986 год – Вышамірская школа стала пераможцам у рэспубліканскім конкурсе-спаборніцтве па вырошчванню трусоў. У ліпені таго ж года піянерскі атрад нашай школы займае 1 месца ў парадзе гістарычных войскаў па выкананню строевых каманд. У 1989 годзе Рэчыцкі раённы камітэт Таварыства Чырвонага Крыжа БССР узнагародзіла санітарны пост Вышамірскай сярэдняй школы, які заняў 2 месца ў раённых спаборніцтвах школьных санітарных каманд за праяўленую кемлівасць і выдатныя веды па аказанні першай медыцынскай дапамогі. У тым жа годзе атрад юных армейцаў Вышамірскай школы заняў 3 месца ў спаборніцтве па стрэльбам у фінале раённай ваенна-спартыўнай гульні "Арляня" [2].

З 1988 года Вышамірская школа перасяляецца ў новы ўтульны двухпавярховы будынак.



Будынак Вышамірскай сярэдняй школы (1988 год – нашы дні)

На той момант дырэктарам школы быў Склімянок Яўгеній Рыгоравіч (на пасадзе са студзеня 1977 па 1990 год) [1].




Калектыў школы у 1980-я гады пад кіраўніцтвам Склімянка Я.Р.

З 1990 года па 1999 год дырэктар Вышамірскай школы – Хулуп Марыя Пятроўна, настаўнік роднай беларускай мовы і літаратуры.



*Хулуп М.П. на уроку беларускай літаратуры*

У 1990 годзе каманда вучняў Вышамірскай школы заняла 1 месца ў раённым конкурсе-аглядзе юных інспектараў дарогі. 1991 год – атрад юных армейцаў займае 1 месца ў конкурсе "Знаўцы дарожнага руху" на абласным фінале гульні "Зарніца". У гэтым жа годзе Вышамірская школа зноў становіцца першай на конкурсе-аглядзе юных інспектараў дарогі. У 1998 годзе кіраўніцтва адукацыі Гомельсага аблвыканкама ўзнагароджвала ганаровай граматай калектыў настаўнікаў і вучняў Вышамірскай школы за актыўны ўдзел у абласным конкурсе на лепшы матэрыял аб гісторыка-культурных каштоўнасцях роднага краю "Край мой, Белая Русь!" [2].

З 1999 года па 2001 год пасаду дырэктара займаў Баранаў Віталій Іванавіч. З пачатку 2000 гадоў школа знаходзілася на рубяжы рэформ. У школе традыцыйна праходзяць цікавыя мерапрыемствы. Вучні займаюць прызавыя месцы на раённых конкурсах. Напрыклад, у красавіку 2001 года у конкурсе "Вучань XXI века" Швед Вольга стала лаўрэатам.

З 2001 па 2012 гады школу ўзначальвала Швед Валянціна Андрэеўна.



Калектыў Вышамірскай сярэдняй школы, 2010 год

2001/2002 навучальны год азнаменаваўся для ўстановы адукацыі прыемнай з'явай – калектыў школы заняў 3 месца сярод усіх школ Рэчыцкага раёна па рамонту і падрыхтоўцы да новага навучальнага года. У 2002/2003 навучальным годзе школа перайшла працаваць па 10-бальнай сістэме ацэньвання ведаў. Цікавасць вучняў да навучання павысілася, бо амаль усе адзнакі станоўчыя, на паўторны курс навучання нікога не пакідалі. У школу прыходзяць працаваць маладыя настаўнікі. Напрыклад, з прыходам Міхедзькі Веры Васільеўны ў школе актывізавалася спартыўнае жыццё, былі адчынены і працавалі спартыўныя секцыі розных накірункаў, вучні ўдзельнічалі амаль ва ўсіх спартыўных раённых мерапрыемствах [2].

З 2012 па 2021 гады дырэктарам школы працавала Цеглянкова Галіна Мікалаеўна. Установа адукацыі падчас яе кіравання кардынальна змянілася і ўнутры, і звонку. Быў арганізаваны рамонт кабінетаў, набылі новыя камп'ютары, мультымедыйную ўстаноўку, мульціборд. Вышамірская школа працягвала не толькі паспяховую адукацыйную і выхаваўчую работу, а таксама памножыла спіс перамог у разнастайных конкурсах. Уменне Галіны Мікалаеўны матываваць, навучаць і арганізоўваць якасную працу неаднаразова выводзіла ўстанову адукацыі на высокія ступені ў адукацыйным, выхаваўчым і творчым п'едэстале.



Педагагічны калектыў, 2018 год

Неаднаразова Вышамірская сярэдняя школа пад кіраўніцтвам Галіны Мікалаеўны Цеглянковай прызнавалася адной з лепшых устаноў Рэчыцкага раёна. [5].



Г.М. Цеглянкова падчас атрымання дыплома

ад Рэчыцкага райвыканкама



Г.М. Цеглянкова падчас атрымання дыплома

на педагагічнай канферэнцыі

З 2022 года і да 2024 года дырэктарам Вышамірскай сярэдняй школы была Кечка Таццяна Рыгораўна. Яе актыўны, дэмакратычны і пазітыўны стыль кіраўніцтва ствараў спрыяльную атмасферу для навучання і выхавання [4].



Святочнае мерапрыемства "Развітанне са школай", 2022 год

Лепшыя традыцыі ўстановы адукацыі, якія былі закладзены першымі настаўнікамі і кіраўнікамі, працягваюцца і сёння. З сучасным дырэктарам Тышкевіч Ірынай Віктараўнай установа адукацыі трымае курс на стварэнне мадэрнізаванай, творчай, прафесійнай школы.





Тышкевіч І.В. вітае вучняў 1 верасня 2024 года на урачыстай лінейцы, прысвечанай Дню ведаў

Плённая праца прафесійных настаўнікаў і адміністрацыі дазваляе рыхтаваць творчых і таленавітых выпускнікоў. За увесь час існавання школы з яе сцен выйшлі выбітныя прафесіяналы сваёй справы: Прахарэнка І.Дз. (выкладчык Мінскага ваеннага вучылішча), Траццякоў М.М. (намеснік міністра МУС), Караленка А.І. (старшыня калгаса XXII з'езда КПСС), Траццякоў П.П. (загадчык кафедры фізвыхавання ГДУ), Пяшкун У.А. (галоўны энергетык Далёкаўсходняга краю, саветнік Дзяржаўнай грамадзянскай абароны РФ), Пяшкун В.П. (палкоўнік), Пяшкун А.П. (старшыня калгаса імя Кірава Лоеўскага раёна), Гарбуз Л.А. (палкоўнік), Склімянок А. Р. (ваенны хірург).

Часта выбітныя выпускнікі збіраюцца ў школе на вечары сустрэч ці проста, каб успомніць свае лепшыя гады, расказаць сучасным пакаленням пра свой лёс, свае прафесійныя поспехі і дасягненні.



*Сустрэча выпускнікоў 1964 года, 2024 год*

Многія выпускнікі пайшлі па слядах сваіх шаноўных настаўнікаў. Вось імёны некаторых вучняў, якія сваё жыццё звязалі з настаўніцкай справай: Склімянок Я.Р., Пятрова В.А, Траццяк Т.М., Баброўнік Л.І., Мікулінская Л.А., Баранаў В.І., Мохарава А.П, Мохарава В.П., Склімянок А.М., Александронец Т.Р., Хвастова Т.А., Пятрэнка Л.М., Чачыла Т.М., Чарпакова І.А., Гапоненка І.А., Грушанава Л.А., Канюшэнка Г.М., Канюшэнка Т.М., Хулуп А.В., Пятрова А.А., Гурыновіч Л.В., Кручкова Л.А., Ясенская Н.А., Бяда Л.В., Мікулінская С.А., Скаромная А.В., Прахарэнка А.А.. Цішкевіч В.В., Анішчанка С.А., Кротава Ю.У., Швед В.В., Строкіна А.М., Іванчыкава К.В., Шалыпа А.М., Кароткая Н.А., Траццякова А.М., Кекух К.К., Анішчанка С.В. і многія іншыя [2].

Вышамірская сярэдняя школа Рэчыцкага раёна вельмі беражліва ставіцца да захавання сваёй гісторыі, праводзіць актыўную культурна-асветніцкую дзейнасць. Штогод праводзяцца сустрэчы з выпускнікамі, на ўрачыстыя лінейкі і разнастайныя мерапрыемствы запрашаюцца настаўнікі – ветэраны педагагічнай працы. У школьным музеі ўжо накоплены багаты фота і відэаматэрыял (альбомы выпускных класаў, рэпартажы пра выбітных настаўнікаў, сюжэты пра школьнае жыццё і многае іншае). Шырокае асвятленне дадзеных матэрыялаў і дзейнасці ажыццяўляецца на школьным сайце (vyeshemir.schools.by), у сацыяльных сетках (Telegram, Instagram).

| | |
|---|---|
| Навіны на школьным сайце Вышамірскай сярэдняй школы Рэчыцкага раёна | Старонка школьнага музея на сайце Вышамірскай сярэдняй школы Рэчыцкага раёна |
| Канал Вышамірскай сярэдняй школы Рэчыцкага раёна ў Telegram | Старонка Вышамірскай сярэдняй школы Рэчыцкага раёна ў Instagram |

Кажуць, усе мы родам з дзяцінства. А школа – гэта месца, дзе мы фарміруемся як асобы. Менавіта той падмурак, які закладваецца ў школе дапамагае чалавеку рухацца праз усё жыццё. Вышамірскую сярэднюю школу па праву можна назваць кузняй таленавітых, інтэлектуальных, працавітых, шчырых, мужных, самаадданых, адказных грамадзян нашай краіны!

## Спіс выкарыстанай літаратуры і інфармацыйныя рэсурсы:


1. Летапіс вёскі Вышамір і навакольных вёсак. Дадатковы фонд Вышамірскага школьнага комплекснага музея. Справа № 7. – 58 лістоў.

2. Летапіс Вышамірскай сярэдняй школы. Дадатковы фонд Вышамірскага школьнага комплекснага музея. Справа № 8. – 69 лістоў.

3. История Беларуси в документах и материалах/Авт.-сост. И.Н. Кузнецов, В.Г. Мазец - Минск: «Алфея», 2000. – 672 с.

4. Р. Котляров. Краевед В.А. Сергеева о жизни, воспитании детей и сохранении памяти: [о жизни и деятельности краеведа В.А. Сергеевой]/газета «Дняпровец»// Р. Котляров – 2024 – 9 апреля – С.5.

5. З летапісу школы. [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: https://vyeshemir.schools.by/pages/iz-letopisi. Дата звароту: 12.02.2025 год.